ВЕСЦІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР № 1 1983
СЕРЫЯ ГРАМАДСКІХ НАВУК

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*М. М. КАРАТКОЎ*

# АБ ЭВАЛЮЦЫІ САЦЫЯЛЬНЫХ І ЭСТЭТЫЧНЫХ ПОГЛЯДАЎ М. ГАРЭЦКАГА

Жыццё і творчасць М. Гарэцкага, аднаго з пачынальнікаў навейшай беларускай літаратуры, прыпадае на перыяд карэнных рэвалюцыйных зрухаў. Нацыянальна-вызваленчы рух на Беларусі ў пачатку XX ст., новы ўздым рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі, імперыялістычная вайна, Вялікі Кастрычнік, грамадзянская вайна, пачатак сацыялістычнага будаўніцтва...

Напрамак эвалюцыі сацыяльных і эстэтычных поглядаў пісьменніка быў абумоўлены як гэтымі гістарычнымі падзеямі, ходам літаратурнага працэсу, так і развіццём асобы М. Гарэцкага як чалавека, грамадзяніна і мастака.

Сацыяльныя і эстэтычныя погляды пісьменніка яскрава выявіліся ўжо ў першых яго апавяданнях, якія пазней увайшлі ў зборнік «Рунь»[1]. У іх М. Гарэцкі даследуе жыццё, імкнучыся ўсвядоміць прычыны цяжкага становішча народа, вызначыць шляхі да яго лепшай будучыні. Шчыра жадаючы бачыць беларускую вёску «цвярозай, светлай, здаволенай жыццём»[2], ён адмаўляе тагачасную рэчаіснасць як нявартую чалавека. Пісьменнік разумее, што цяжкае становішча народа выклікана перш за ўсё векавым прыгнётам паноў, але ў той жа час адмоўна ставіцца і да праяў інертнасці, нядбайства, п'янства, пэўнай абыякавасці сялян да свайго лёсу, неразумення імі значэння асветы ў жыцці чалавека. У гэтым праявіліся асветніцкія тэндэнцыі ў ранняй творчасці М. Гарэцкага.

Асветніцтва М. Гарэцкага — асветніцтва асобага роду. Не абыходзячы адмоўных з'яў у жыцці народа, ён здолеў убачыць і паказаць і тое станоўчае, што ў ім было, багацце і напружанасць духоўнага жыцця беларусаў, імкнуўся абудзіць у іх нацыянальную свядомасць, пачуццё чалавечай годнасці, імкненне да лепшай долі.

У сваіх ранніх творах М. Гарэцкі настойліва шукаў той тып сацыяльна актыўнага героя, які здолеў бы ўзняць народ на барацьбу за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне. Такога героя ён у той час убачыў у інтэлігенце, выхадцы з народных мас. Таму тэма народа і інтэлігенцыі — цэнтральная тэма ранніх твораў пісьменніка.

Найбольш лагічна і паслядоўна свае сацыяльныя і эстэтычныя погляды М. Гарэцкі выказаў у артыкулах «Наш тэатр»[3] і «Развагі і думкі»[4], асноўны пафас якіх — абарона права беларускага народа на сваю культуру. Пісьменнік ставіць задачу ўзняць яе да ўзроўню найбольш развітых нацыянальных культур народаў свету, што сцвердзіла б права беларускага народа называцца самастойнай нацыяй. Гэта было асабліва важна ў той час, бо як царскі чарнасоценны ўрад, так і польскія буржуазныя шавіністы адмаўлялі беларусам у такім праве.

У развіцці нацыянальнай культуры і перш за ўсё літаратуры і тэат-

---

[1] Гарэцкі М. Рунь.— Вільня, 1914.
[2] Гарэцкі М. Выбраныя творы. У 2-х тамах.— Мн.: Мастацкая літаратура, 1973, т. 1, с. 23.
[3] Гарэцкі М. Наш тэатр.— У кн.: Калядная пісанка. Вільня, 1913, с. 13—26.
[4] Гарэцкі М. Развагі і думкі.— У кн.: Вялікодная пісанка. Вільня, 1914, с. 31—61.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ра пісьменнік бачыў важны сродак абуджэння народных мас. Герой апавядання «Рунь» Уладзімер З. становіцца пісьменнікам, каб «словам адраджаць народ»[5].

М. Гарэцкі выступае за дзейсную грамадзянскую пазіцыю літаратуры, яе народнасць, мастацкую праўдзівасць[6]. Святы абавязак пісьменніка, лічыць ён,— шукаць народу дарогу да праўды[7]. Менавіта арыентацыя на народныя масы і лепшыя сілы інтэлігенцыі ў барацьбе за вызваленне народа ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту дазволіла пісьменніку з цягам часу ўсвядоміць законы развіцця грамадства, стаць у рады будаўнікоў новага жыцця пасля Вялікага Кастрычніка.

Адстойваючы правы беларусаў «людзьмі звацца», М. Гарэцкі выступае з пазіцый інтэрнацыянальнай еднасці працоўных. Шлях да вызвалення беларускага народа, лічыць ён, «ідзе поплеч і блюжынька са шляхам працуючага дэмасу ўсяго свету і вядзе, мусіць, да адной мясцінкі»[8]. Ідэал пісьменніка — дэмакратычная Расія, якую насяляюць раўнапраўныя свабодныя народы.

Такім чынам, на важнейшыя пытанні часу М. Гарэцкі адказвае зыходзячы з агульнадэмакратычных пазіцый. І гэта не выпадкова. Сын малазямельнага селяніна з глухога кутка Мсціслаўшчыны, далёкага ад цэнтраў пралетарскага руху, ён востра адчуваў несправядлівасць ладу тагачаснага грамадства. Вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду М. Гарэцкага аказалі творы класікаў рускай літаратуры, беларускіх прагрэсіўных пісьменнікаў, а таксама перадавая дэмакратычная інтэлігенцыя, сярод якой была пашырана ідэя асветы народа як сродку карэннага паляпшэння яго становішча.

Ставячы пытанне развіцця беларускай літаратуры, узняцця яе да ўзроўню найбольш развітых нацыянальных літаратур, М. Гарэцкі спрабуе намеціць шляхі і напрамкі, па якіх яна, на яго думку, павінна была развівацца. Кожная нацыянальная літаратура, заўважае ён, мае свае непаўторныя рысы, якія вынікаюць з асаблівасцей характару народа, і пісьменнік павінен імкнуцца выразіць душу свайго народа, калі ён мае на ўвазе развіваць літаратуру нацыянальную. Народ, які стварыў прыгожую і выразную мову, багаты і змястоўны фальклор, сцвярджае пісьменнік, і цяпер валодае велізарным творчым патэнцыялам, здольны ўнесці ўклад у скарбонку сусветнай культуры[9]. Пры спрыяльных умовах, лічыць ён, літаратура беларускага народа будзе мець значэнне сусветнае[10]. М. Гарэцкі заклікае беларускіх пісьменнікаў, абапіраючыся на ўзоры класічнай літаратуры, творча выкарыстоўваючы лепшыя традыцыі вуснапаэтычнай народнай творчасці, праўдзіва адлюстроўваць жыццё, надзеі і імкненні свайго народа[11]. Сярод надзённых задач развіцця беларускай літаратуры ён называе выпрацоўку індывідуальных стыляў пісьменнікаў, развіццё літаратурнай крытыкі, унармаванасць беларускай мовы, стварэнне яе граматыкі, авалоданне буйнымі жанравымі формамі, майстэрствам паказу перажыванняў чалавека[12].

Творчасць сапраўднага мастака — гэта не ілюстрацыя да яго думак, бо яе аснова — само жыццё, шматграннае і шматфарбнае. Апавяданні М. Гарэцкага на гістарычныя тэмы («Лірныя спевы» і асабліва раздзел «Войт» з апавядання «Рунь») сведчаць не толькі аб жаданні іх аўтара паказаць гістарычнае мінулае свайго народа, але і аб пошуках ім у мінулым адказу на пытанні сучаснасці. У апавяданнях, прысвечаных праблеме «народ і інтэлігенцыя» («У лазні», «Роднае карэнне», «У чым

[5] Гарэцкі М. Рунь, с. 4.
[6] Гарэцкі М. Развагі і думкі, с. 49—52.
[7] Гарэцкі М. Наш тэатр, с. 26.
[8] Гарэцкі М. Развагі і думкі, с. 42.
[9] Гарэцкі М. Наш тэатр, с. 18.
[10] Гарэцкі М. Развагі і думкі, с. 59.
[11] Гарэцкі М. Наш тэатр, с. 25.
[12] Гарэцкі М. Развагі і думкі, с. 52—55; Яго ж. Рунь, с. 10.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яго крыўда?», «Рунь»), пісьменнік, верны праўдзе жыцця, адлюстраваў не толькі шчырае жаданне лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі аблегчыць пакуты народа, але і паказаў, што яны не ўсвядомілі ідэалаў, за якія трэба змагацца, не маюць станоўчай праграмы дзеяння, блізкай і зразумелай народным масам.

Найбольш яскрава гэта праявілася ў апавяданні «Рунь». Хоць у свой час акадэмік Я. Ф. Карскі адзначаў, што гэты твор па задуме «некалькі напамінае вядомы раман Чарнышэўскага «Што рабіць?»[13], заўважым, што Уладзімер З., галоўны герой гэтага твора, не можа адказаць менавіта на гэта пытанне — што рабіць? Ён прызнаецца сабе ў тым, што не мае пэўных ідэалаў, праграмы барацьбы за вызваленне народа, і прыходзіць да вываду, што адказ на ўсе пытанні часу павінна даць само жыццё. Па сутнасці, гэта апавяданне сведчыла аб якасных зменах у светапоглядзе пісьменніка, пераадоленні ім ілюзій асветніцтва і азначала завяршэнне першага этапа ў эвалюцыі яго сацыяльных і эстэтычных поглядаў, перыяду асветніцкіх тэндэнцый і пэўнага рацыяналізму ў яго творчасці.

Галоўны змест новага этапа ў эвалюцыі поглядаў пісьменніка, які ахоплівае перыяд з 1914 па 1917 г., заключаўся ў паглыбленым даследаванні жыцця сродкамі мастацкай літаратуры, змене напрамку пошукаў героя новага часу. Этапным творам гэтага перыяду з'яўляецца «Антон» (Абразы жыцця), твор складаны, шматпланавы, філасофскі[14]. М. Гарэцкі шукае свайго героя ўжо не сярод інтэлігенцыі, а ў самім народзе. Думаецца, што гэта было выклікана не толькі тым, што ён адчуў няздольнасць апошняй вывесці народ на шырокія прасторы жыцця, але і ростам свядомасці і актыўнасці народных мас, разуменнем таго, што беднасць народа, яго непісьменнасць, п'янства — не прычына, а абставіны яго цяжкага становішча.

«Беларускі аўтар», які ў «Антоне» выказвае погляды самога пісьменніка, на заўвагу «Маскоўскага дэмакрата» аб неабходнасці стварэння ў беларускай літаратуры новага тыпу чалавека-беларуса адказвае, што жыццё яшчэ не стварыла такога тыпу, і таму ён не можа быць адлюстраваны мастацкай літаратурай. На думку «Беларускага аўтара», такі тып будзе створаны ёю тады, калі будуць усвядомлены прычыны крызісу ў жыцці народа, ідэалы, да якіх трэба імкнуцца. Ён адчувае, што новы тып беларуса-чалавека ўжо нарадзіўся[15]. Як і многія іншыя прагрэсіўныя беларускія пісьменнікі, М. Гарэцкі ў той час шукае такі тып сярод сялянства, бо к таму часу ён яшчэ не прыйшоў да ўсведамлення ролі пралетарыяту ў барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне народа.

У духоўнай драме, лёсе Антона Жабона пісьменнік бачыць сведчанне абуджэння народных мас, пошукаў імі шляхоў да лепшага жыцця. М. Гарэцкі прыходзіць да разумення таго, што драма Антона абумоўлена прычынамі сацыяльнымі, што Антон шукаў праўду не на тых дарогах. Расце рэвалюцыйная свядомасць народа, але сялянскія выступленні яшчэ разрозненыя і слаба арганізаваныя. Калі на першым этапе сваёй творчасці М. Гарэцкі бачыў шлях да шчасця народа перш за ўсё ў асвеце, то ў «Антоне» ён, па сутнасці, падыходзіць да пытання аб неабходнасці змены саміх сацыяльных абставін жыцця народа. У той жа час ён яшчэ не бачыць той сацыяльнай сілы, якая здолела б зрабіць гэта. Менавіта таму, відаць, лічыў ён дачасным з'яўленне ў беларускай літаратуры твораў тыпу «Што рабіць?», хоць і разумеў, што такія творы ў пэўнай ступені могуць актывізаваць пошукі адказаў на пытанні жыцця.

У «Антоне» М. Гарэцкі сцвярджае важную думку аб тым, што толь-

[13] Карский Е. Ф. Белорусы.— Пг., 1922, т. 3, кн. 3, с. 371.
[14] Гарэцкі М. Выбраныя творы. У 2-х тамах, т. 1, с. 335—417.
[15] Там жа, с. 403—408.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кі тыя мастацкія творы, якія закранаюць агульначалавечыя пытанні, могуць мець непераходзячае значэнне[16]. Ужо ў першых сваіх творах ён ставіць рад праблем агульначалавечага характару: жыццё і смерць, сэнс чалавечага жыцця, межы пазнання чалавекам рэчаіснасці, чалавек і рэлігія, чалавек і вайна і г. д. Думаецца, што зварот да гэтых праблем быў выкліканы жаданнем пісьменніка зразумець сам «корань рэчаў», законы жыцця і праз гэта — законы гістарычнага развіцця грамадства, убачыць яго перспектывы.

Шлях да разумення сацыяльнай сутнасці тагачаснага грамадства, пошукаў героя новага часу для М. Гарэцкага ішоў праз пакутлівы роздум над «вечнымі пытаннямі», гістарычным мінулым беларускага народа і яго сучасным жыццём, праз асэнсаванне падзей імперыялістычнай вайны, якая абвастрыла і агаліла класавыя супярэчнасці. Гібель на франтах мільёнаў людзей у імя далёкіх і чужых народу мэт, да якіх імкнуліся правячыя колы царскай Расіі, руйнаванне плёну працы чалавечых рук, разарэнне гаспадаркі, галеча прымушалі людзей задумацца, у імя чаго і каго яны руйнуюць і нішчаць. Рос пратэст народных мас супраць вайны. Для М. Гарэцкага імперыялістычная вайна, па сутнасці, стала такой школай сацыяльных навук, якой была рэвалюцыя 1905—1907 гг. для старэйшых беларускіх пісьменнікаў. У гэтым сэнсе можна сказаць, што сталая проза пісьменніка «выйшла з салдацкага шыняля». Менавіта на франтах імперыялістычнай вайны адчуў ён усю вастрыню класавых супярэчнасцей, убачыў сілу калектыву, арганізаваных мас, рост іх класавай свядомасці. Прадчуванне М. Гарэцкім блізкай рэвалюцыі было выклікана як усім ходам падзей, так і духоўным развіццём самога пісьменніка. У поўнай меры зведаўшы гэту вайну, ён у сваіх творах бязлітасна выкрывае яе бесчалавечную сутнасць. Па свайму гуманістычнаму гучанню, антываеннаму пафасу, мастацкіх якасцях творы М. Гарэцкага аб імперыялістычнай вайне стаяць на ўзроўні лепшых твораў на гэту тэму.

Найбольш напружаным у жыцці пісьменніка, эвалюцыі яго сацыяльных і эстэтычных поглядаў быў перыяд 1918—1923 гг. Ён прыняў рэвалюцыю, актыўна супрацоўнічае ў бальшавіцкім друку. Радасна вітае пісьменнік утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, бачыць яе шлях «у камунізме і яднанні з камуністамі Савецкай Расіі»[17].

Пісьменнік працуе ў 1-й Віленскай беларускай гімназіі, выкладае беларускую мову ў праваслаўнай духоўнай семінарыі, рэдагуе прагрэсіўныя беларускія газеты, піша рад навуковых прац: «Гісторыю беларускае літаратуры» (выдавалася ў 1920, 1921, потым двойчы перапрацоўвалася і выходзіла ў 1924 і 1926 гг.), зборнік для чытання «Дэкляматар» (1921), «Хрэстаматыю беларускай літаратуры. XI век — 1905 год» (1922), «Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік» (1919), «Маскоўска-беларускі слоўнік» (1920).

У публіцыстычных артыкулах М. Гарэцкі заклікае беларускі народ да яднання, палітычнай актыўнасці, абароны сваіх інтарэсаў ва ўмовах акупацыі войскамі буржуазнай Польшчы. З вялікім задавальненнем адзначае ён поспехі развіцця беларускай нацыянальнай культуры ў Савецкай Беларусі: «...Там сёлета скрозь заведзены школы на беларускай мове, адчыніўся беларускі універсітэт і многа чаго іншага, дужа памыснага зрабілася для нашае культуры»[18]. У тым жа артыкуле, паказваючы становішча беларусаў на акупіраванай тэрыторыі, М. Гарэцкі адзначае: «Найгорш стаяць нашы справы ў беларусаў пад Польшчаю і ў Сярэдняй Літве... Там беларусы не маюць ніякай вагі ў грамадскім жыцці, хоць набярэцца іх за мільён».

Галоўныя тэмы твораў М. Гарэцкага ў гэты перыяд — народ і рэвалюцыя, інтэлігенцыя і рэвалюцыя, гістарычнае мінулае Беларусі. Час

[16] Гарэцкі М. Выбраныя творы. У 2-х тамах, т. 1, с. 407.
[17] Известия Смоленского Совета, 1919, 4 студз.
[18] Беларускія ведамасці, 1921, 3 кастр.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ставіў свае няпростыя пытанні. Задача сапраўднага мастака заключалася ў тым, каб убачыць гістарычную перспектыву, зразумець і правільна ацаніць падзеі. Мастак у сваёй творчасці абапіраецца перш за ўсё на ўласныя назіранні і ўражанні. Для М. Гарэцкага перыяд 1919—1923 гг. быў перыядам напружанай работы па асэнсаванню падзей, выпрацоўцы сваёй пазіцыі ў дачыненні да іх. Пісьменнік не мог яшчэ даць поўных адказаў на пытанні часу, але ў сваіх творах востра ставіў іх перад грамадскасцю. Рэвалюцыя і гуманізм — вось цэнтральная праблема яго мастацкага даследавання рэчаіснасці.

Гэтай праблематыцы прысвечана і яго аповесць «Дзве душы»[19]. Галоўны герой аповесці Абдзіраловіч, інтэлігент, гуманіст, імкнецца асэнсаваць рэчаіснасць, знайсці сваё месца ў жыцці, барацьбе за шчасце народа. Сваім выхаваннем, адукацыяй Абдзіраловіч звязаны з каштоўнасцямі старога свету, але ў той жа час ненавідзіць гэты свет уласніцтва, прыгнёту чалавека чалавекам. Таму ён не пакутуе ад таго, што стары свет разбураны рэвалюцыяй. У яго не выклікае сумнення гуманістычная сутнасць ідэй камунізма, але ён не ўпэўнены, што гэтыя ідэі можна ажыццявіць, асабліва рукамі такіх людзей, як Гаршок, хоць і разумее, што такія людзі выпадковыя ў партыі бальшавікоў. Галоўная прычына доўгіх ваганняў Абдзіраловіча — у абстрактнасці яго гуманізму. Яго палохае непрымірымасць, жорсткасць класавай барацьбы, кроў. Але гэта часовыя ваганні. Думаецца, Абдзіраловіч непазбежна прыйдзе ў стан рэвалюцыі, бо калі яго часам і бярэ злосць на такіх Гаршкоў, то супраць паноў у яго душы расце «штосьці тупое, цяжкае, нянавіднае, што не магло яшчэ прарвацца ў звычайнай злосці і быццам чакала асаблівай дарогі для свайго разгону»[20]. Само паняцце гуманізму ва ўмовах класавай барацьбы не можа быць безадносным, не мець класавага адцення. У гэтай аповесці М. Гарэцкі зыходзіць з канцэпцыі справядлівасці барацьбы прыгнечаных класаў грамадства за сваё вызваленне. Але на мастацкім узроўні твора адбіўся недахоп вопыту рэвалюцыйнай барацьбы яе аўтара. Прыватнае, выпадковае часам засланяе галоўнае.

Апавяданні М. Гарэцкага аб часах прыгону на Беларусі, якія пазней увайшлі ў зборнік «Досвіткі» (Мінск, 1926), былі спробай асэнсавання мінулага з пазіцый сучаснасці і разам з тым асэнсавання самой сучаснасці. Адмаўляючы прыгнёт чалавека чалавекам, пісьменнік сцвярджаў ідэю гуманнасці рэвалюцыі, якая вызваліла народ ад прыгнёту паноў. Асуджэнне ўласніцтва, улады грошай над душой чалавека — асноўная ідэя апавядання «Сасна» (1921) і сцэнічнага твора «Мутэрка» (1921).

Сацыяльныя і эстэтычныя погляды пісьменніка ў той перыяд яскрава выявіліся ў «Гісторыі беларускае літаратуры», першай, па сутнасці, спробе асэнсавання гісторыі развіцця беларускай літаратуры як адзінага працэсу[21]. Выходзячы з прынцыпаў сацыялагічнага метаду, М. Гарэцкі ў сваім даследаванні разглядае творы як з боку іх сацыяльнага зместу, так і з боку мастацкай формы. Літаратура, лічыць ён, толькі тады можа быць сапраўдным мастацтвам, калі яна накіравана на служэнне працоўнаму народу, прасякнута пафасам сацыяльнасці і высокім гуманізмам.

Аб канчатковым пераходзе М. Гарэцкага на пазіцыі пралетарскай літаратуры, паглыбленні сапраўднага гістарызму ў яго творчасці сведчаць абразкі «Чырвоныя ружы»[22]. У гэтым творы пісьменнік зыходзіць з канцэпцыі народа як творцы гісторыі, з усведамлення гістарычнай справядлівасці і непазбежнасці барацьбы класаў за сваё вызваленне, дзейснага пралетарскага гуманізму.

---

[19] Гарэцкі М. Дзьве душы.— Вільня, 1919.
[20] Там жа, с. 179.
[21] Беларуская крытыка і літаратуразнаўства.— Мн.: 1975, с. 65—87.
[22] Вольны сцяг, 1923, 26 і 28 вер.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Новы перыяд у жыцці і творчасці пісьменніка пачынаецца ў кастрычніку 1923 г., калі ён пераязджае ў Савецкую Беларусь. У 1924, а потым у 1926 г. ён перапрацоўвае «Гісторыю беларускае літаратуры», якая доўгі час з'яўлялася адзіным падручнікам па гэтаму прадмету ў школах і ВНУ, выкладае на рабфаку Беларускага універсітэта, потым беларускую мову і літаратуру ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, працуе ў Інбелкульце, а потым у АН БССР. Ён выступае як пісьменнік, літаратурны крытык, перакладчык, фалькларыст. Творы, прысвечаныя савецкай рэчаіснасці, поўныя адчування перамен да лепшага ў жыцці («Мсціслаўшчына», 1925; «Сібірскія абразкі», 1926). Народ жыве яшчэ беднавата, шмат якія пытанні яшчэ не вырашаны, але змянілася самае галоўнае — адносіны паміж людзьмі, паміж народам і органамі ўлады, якая стала ўладай самога народа. Перапрацаваныя выданні «Гісторыі беларускай літаратуры» 1924 і 1926 гг., крытычныя артыкулы М. Гарэцкага другой палавіны 20-х гадоў сведчаць аб паглыбленні гістарызму ў ацэнцы даследчыкам з'яў літаратуры.

Шмат увагі ўдзяляе пісьменнік перапрацоўцы твораў, напісаных да 1923 г., удакладненню іх зместу, адлюстраванню савецкай рэчаіснасці («Люстрадзён», 1929). Зноў і зноў вяртаецца ён да старонак мінулага — падзей імперыялістычнай вайны («На імперыялістычнай вайне», «Ціхія песні», 1926; «Жартаўлівы Пісарэвіч», 1925), часоў прыгону (зборнік «Досвіткі», 1926), імкнучыся глыбей асэнсаваць гістарычныя шляхі беларускага народа. М. Гарэцкі збірае матэрыял для шырокага мастацкага палатна аб яго жыцці ад часоў прыгону да сучаснасці — «Камароўскай хронікі». Задума стварэння мастацкай гісторыі жыцця беларускага народа ўзнікла ў М. Гарэцкага яшчэ ў першыя паслярэвалюцыйныя гады, але з-за неспрыяльных умоў ён змог толькі часткова ажыццявіць яе ў рамане-хроніцы «Віленскія камунары» (1932).

У «Віленскіх камунарах» пісьменнік здолеў намаляваць праўдзівую карціну народнага жыцця, барацьбы народа за лепшую будучыню, стварыць вобразы сапраўдных камуністаў. Думаецца, што паглыбленню гістарызму ў творчасці М. Гарэцкага, глыбокаму спасціжэнню ім шляхоў і законаў развіцця грамадства, авангарднай ролі партыі пралетарыяту ў барацьбе за вызваленне народа ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту ў многім садзейнічала работа М. Гарэцкага па перакладу на беларускую мову твораў У. І. Леніна, лепшых твораў пралетарскіх пісьменнікаў (апавяданні М. Горкага, «Разгром» А. Фадзеева, «Камісары» Ю. Лібядзінскага, 1928—1929). Калі ў «Чырвоных ружах» барацьба народных мас, рэвалюцыя паказаны пісьменнікам у многім як стыхійны працэс, то ў «Віленскіх камунарах» ён здолеў паказаць працэс паступовага росту класавай свядомасці, пераход народных мас ад пасіўнага пратэсту і стыхійнага бунту да арганізаванага рэвалюцыйнага змагання, ролю партыі бальшавікоў у гэтым змаганні.

Творчасць М. Гарэцкага — надзвычай вялікая і шматгранная з'ява ў беларускай літаратуры. Гуманіст, інтэлігент, М. Гарэцкі выступіў у сваёй творчасці як мастак-рэаліст. Разам з іншымі прагрэсіўнымі беларускімі пісьменнікамі ён зрабіў мастацкую літаратуру магутным сродкам маральнага і эстэтычнага выхавання народных мас, спрыяў сцвярджэнню ў ёй рэалізму як галоўнага мастацкага метаду. Творча выкарыстоўваючы вопыт і лепшыя традыцыі сусветнай літаратуры, ён узбагаціў беларускую нацыянальную літаратуру новымі тэмамі, жанрава-стылявымі формамі.

У сваім развіцці М. Гарэцкі прайшоў шлях ад ідэй асветніцтва, праз крытычны рэалізм да рэалізму сацыялістычнага. Адным з першых пракладваў ён беларускай прозе шлях да нацыянальнага эпасу новага часу.

*Інстытут літаратуры*
*імя Янкі Купалы АН БССР*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## Резюме

На основе анализа художественных и публицистических произведений М. Горецкого, его литературно-критических работ прослеживаются основные этапы эволюции его социальных и эстетических взглядов.



## Summary

The analysis of the works of art by M. Goretsky as well as of his publicistic and critical works allows to trace the main stages of evolution of his social and aethetical views.


...ный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку...